## 29 САКАВІКА Даты Падзеі Людзі




**1880** год — нарадзіўся Яўген Вітольдавіч Корчыц, вучоны ў галіне хірургіі, доктар медыцыны, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Скончыў Пецярбургскі, а затым і Маскоўскі ўніверсітэты. Працаваў земскім урачом. У гады Першай сусветнай і грамадзянскай войн — хірург ваенных шпіталяў. З 1926 года выкладаў на медыцынскім факультэце БДУ, пасля быў загадчыкам кафедры шпітальнай хірургіі Мінскага медыцынскага інстытута. Аўтар звыш 100 навуковых прац, у т. л. 12 манаграфій і падручнікаў.

**1900** год — нарадзіўся Уладзімір Уладзіміравіч Корш-Саблін, беларускі кінарэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны артыст Беларусі і СССР. Адзін з заснавальнікаў беларускага мастацкага кінематографа, у якім працаваў з 1925 года. Асноўнае месца ў творчасці займалі фільмы гісторыка-рэвалюцыйнай тэматыкі з характэрнай рамантычнай прыўзнятасцю, эпічнай шырынёй. Як рэжысёр дэбютаваў фільмам «У агні народжаная». Пастаноўшчык першага гукавога фільма ў беларускім іграавым кіно «Першы ўзвод». Паставіў фільмы «Залатыя агні», «Пяюць жаваранкі», «Канстанцін Заслонаў» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі і Дзяржаўнай прэміі СССР.




**1561** год — нарадзіўся Санторыа (або Санкторыус), італьянскі ўрач, анатам, фізіёлаг, які першым вынайшаў і выкарыстоўваў тэрмометр і вымяральнік пульса.

**1886** год — атрымаўшы перамогу ў матчы з Ёганам Цукертортам, Вільгельм Стэйніц стаў першым афіцыйным чэмпіёнам свету па шахматах.

**1912** год — даследчык Антарктыкі Роберт Скот зрабіў свой апошні запіс у дзённіку, не дайшоўшы ўсяго некалькі кіламетраў да сваёй базавай станцыі.

**1973** год — завяршыўся вывад амерыканскіх войск з Паўднёвага В'етнама.

**1936** год — нарадзіўся Станіслаў Гаварухін, савецкі і расійскі кінарэжысёр, акцёр.